БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
...рпухоуская вул. д. № 12

...акцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
...міністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
...акцыя пакідае за сабой права па...уляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Міиску на 1 месяц 3 рубл.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стр 1 руб.
на апошняй—50 ка

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 81. Менск. Чацьвер 4 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Бульбяная мука уселякаго роду рэквізуецца. Меньш ...фунтау ад рэквізыцый асвабаджаецца. Прыемная цана ...марак за пуд.

Камэндант
НАГЭЛЬ.
Генэрал-лейтэнант.

Меськая Рада даводзіць да ведама асобау, што ула...ваюць уселякаго родзаю концэрты, спэктаклі, вечары і ...ад. увесяленні, што пастанова б. Думы аб зьбіраньні ...ькаго збору і даун. Ваеннаго (перайменаванаго у доб...ынны) зацьверджэна Нямецкімі Уладамі і зборы гэныя ...1 ліпня г. 1918 году будуць узысківацца Радаю з усіх ...эй найменаваных-увесяленняу у поунай меры.

Меські войт *С. Хржонстоускі.*

Член Рады *В. Цывінскі*

За Дзелавода В. *Кавецкая.*

На аснове распараджэння Нямецкаго Комэндантскаго ...аулення ад 25 чэрвеня 1918 г. пад № 950/2598, Мэды...скі Аддзел Меськай Рады абвешчае, што 4 абавязковай ...тановы Нямецкаго Комэнданта ад 17 мая 1918 г. аб за...егах проці пошэстных хваробау, у часьці, якая датыча ...рычных хваробау зьменяецца. Ад гэтаго для дактароу, ...ьчароу і акушэрак абавязкова толькі заяука лічбы што...іна зарэгістраваных імі вэнэрычных занедужань. Ні аз...энне пры заяуках прозьвішчау, адрэсау вэнэрычна хво...ні цягне за сабой грашавой кары.

Член Рады *В. Цывінскі*

За Дзелавода *В. Кавецкая.*

Менск 4/VII.

...ытэт і нацыянальна-беларуская гарантія.

...орміруецца новая белару... нацыянальная улада. Ра... ...еларускай Рэчы Паспалі... ...даверыла гэту надзвычай... ...ажную місію Р. Скір...у. Гэтымі днямі заданне ... ім выпоунено. Цікава ...мніць, што па усей тэры...і б. Імпэрыі наша Рада ... старэйшае народнае прэд...ніцтво. У ліпні 1917 г. ...ля першаго беларускаго ...у зроблены быу Нацыя...ны Камітэт. Меняліся фор... назвы, а ядро цяпераш... Рады прыемліма перэвыбі...ся і у ліпні будзе юбілей ...янальнаго злучэння усяго ...у. У радзе адбівалася на...ная мудрасьць нашай ста... Беларусі. Шчасьце баць...чыны і закаханне да яе ...а і стаіць вышэй партый... лозунгоу і зводак. У па...ы мамэнт беларусы без ...цы партыі рабілі ядзіны ...рускі фронт і злуча...у адну волю у адну на... Рада мaецъ шмат ніпры...ікоу, але ніхто ні можа адмовіць ей у беларускім патрыятызму.

Новае нашэ міністэрство, каторае Рада даручыла арганізаваць яг. Скірмунту, павінно адпаведаць палітычнаму і міжнароднаму мамэнту, яно павінно быць без спрэчкі аутарытэтным у Эуропэйскім разуменіі, яно павінно быць гаранціяй для дэмократыі у тым, што будзе нацыянальным беларускім па духу.

Такое міністэрство будзе мець поунае давэрье Рады і усяго злучанаго і абяздоленнаго Краю.

Усе беларусы пойдуць за ім і паттрымаюць яго у працы па адражэнню беларускай дзержаунасьці і беларускай культуры

Можа гэта Рада дачэкаецца тай шчасьлівый гадзіны, калі яна перэдасьць сваі права Вяліканy Вольнаму Сойму Беларусі і скажыць: «Мы сваімі слабымі сіламі давялі беларускі карабель да берэга, мы ні трацілі галавы у буры і шторму, мы ні зьбіліся з дарогі, нам сьвяціла пуцяводная зорка — шчасьце і каханне бацькаушчыны, мы ні селі на мелкае і абайшлі усе падводныя каменні. Нацыя нам перэдала свой сувэрынітэт, мы яго парод».

Дай жа Божа!

Агульныя весткі.

ВЭРЛІН, 30/VI. Керэнскі прыбыў у Парыж.

ЖЭНЭВА. Згодна весткам газэты «Овр», вуглявыя рэзэрвы Парыжа і ваколіц панізіліся да мінімума. Транспарты апалу с прычын перапоупення гаваней і затаплення караблёў, вельмі слабыя. Цэны на вуглі дайшлі да нібывалай высаты.

БЭРЛІН, 30/VI. Па французкаму хлебнаму бону за чэрвень месяц, на кожную асобу выдаецца па 100 грамаў хлеба. На другой старане боны надрукованы гаворкі французкіх нацыянальных гэрояў, як напр., Клемансо, якія дадаюць духу насяленню да дальнейшаго вытрывання.

ЛУГАНО. Міланскім трыбуналом прыгавораны да 5 гадоў і 10 месяцаў турмы аптэкар Брэнты, даставіўшы Сербскаму ураду на 300.000 лір мэдыкамэнтаў-фальсіфікатаў. як напр., замест аспірына—парашок магнэзыі і інш.

РОТТЭРДАМ. У Торонто (Канада) адбыліся, згодна весткам «Таймса», с прычын арэштавання аднаго рабочаго, сур'ёзныя беспарадкі. Арэштавано ўсяго каля 100 чалавек па большасьці расійцаў. Павэдлуг чутак, расійцы будуць прызваны да ваеннай службы альбо адпраўлены назад у Расію.

КРЫСТЫЯНІЯ. Нарвежскі хаўрус прыхільнікаў міру рэшыў зрабіць ва усіх (сельскіх) цэрквах на першай нядзелі у жніўні набожэнство аб міры. Адночасна адбудзецца дэмонстрацыя за доўгі мір і за хаўрус народаў. Спадзяюцца мець водклік і у другіх мейсцах.

ШТОКГОЛЬМ. Швэдскім урадам выданы у пастанове ад 20 чэрвеня вялікі лік важных забаронаў вывозу. Гэтым самым большая часьць швэдскаго вывазу належыць да гэтай забароны і так сама ад асобых вывазных варункаў.

Весткі з Расіі.

— **Штокгольм.** У Маскве узброеная шайка уварвалася у народны камісарыят па сельскай гаспадарцы і разагнала дзержаўныя ўласьці, захапіўшы пры гэтым с сабою 2 мільёны рублёў.

Савецкія ўласьці арэштавалі 59 левых соцыял-рэвалюцыянэраў западазронных у контр-рэвалюцыі.

— **Міхаіл Александровіч.** Нельга пакуль што выясніць адносіны уцекшаго с Пэрмі Міхаіла Александравіча Романова да боручыхся партыяў Расіі. Мабыць, ён адмовіўся ад ідэі паслужыць монархічнай партыі кандыдатам на трон. Наадварот ён схілены, як відаць, прэдаставіць разрэшэнне дзержаўных рэформ Расіі Устаноўчаму Сойму. Аб яго партыйнасьці можна будзе судзіць толькі тады, калі будзе ведамо мейсцо яго прэбывання. Пакуль, павэдлуг чутак, ён знаходзіцца у лагеры чэхаў. Судзючы па гэтаму, бадай можна казаць, што ён зрабіўся арудзьем дзержау Згоды і іх расійскіх прыхільнікаў.

З Украіны.

— **Бэрлін, 1/VII.** У Палтаве, прыналежачай да Украіны, пры унівэрсытэці адчыняецца 1 ліпня юрыдычны факультэт.

Чырвонагвардэйцы, Чэхословакі і... народы у Расіі.

Руская рэвалюцыя паказала усяму сьвету адзін дзіўны факт. Насколькі у Расіі пасьля рэвалюцыі аказаўся агульны пацыфізм—бажанне піваеннаго жыцця,—настолькі-ж узмацаваўся мілітарызм, але асобнаго гатунку—ўнутраны. «Контр-рэвалюцыя, якую вівольніцкая псіхалёгія масс бачыла паўсюдах і ва усім,—да цэлых камашаў на пагах, уключаючы—запатрабавала ад «новай» Расіі пі малай ваеннай натугі. Сьперша, было, за падтрыманне «волі» і змаганне с контр-рэвалюцыяй узяліся піспадзеванныя соцыялісты чыстай вады у салдацкіх шынэлях—цёмнае мужыч'ё с Тулы і Разані і «вся іжэ с німі»,—але потым ім гэта абрыдало і яны пайшлі дзяліць сабе зямлю, забраўшы вінтоўкі—на усякае здарэнне.

І вот прышлося шукаць новай сілы. Яна была знойдзена. У аграмністай тэрыторыяльнай Расіі аказалася досыць усякаго сьмецця,—безработных жулікаў, былых крыміналістаў, каторых Керэнскі выпусьціў на фронт для вайны з немцамі, згубіўшых усё і нават надзею на што небудзь беженцау, як латышы і шмат палякоў, выпісанных у свой час кітайцаў і усякіх дзікіх плямён, якіх ішчэ досыць у гордай сваёй духоўнай культурай Расіі. Да іх далучаны былі праз цэхавых алкоголікаў, разбэшчаных прэдстаўнікоў рускаго андрэеўскаго флагу матросаў.

Поруч з гэтым, рэвалюцыйны псіхоз кідаў у гэту кашу тысячы пакалечанай дрэнным выхованнем у расійскіх школах моладзі, для якой «інтэлігентныя» разбойнікі—Савіцкі і Маруся Нікіфорова—былі ідэалам.

Стварылася, такім чынам, тая соцыялістычная «красноармія», «красногвардыя», а па просту тая інтэрнацыянальная разбойніцкая банда, каторай арудуючы «т. т.» Леніны і Троцкія правілі над усёй Расіяй. Латышскія стральцы і варшаўскія рэвалюцыйныя батальёны, тэкінскія полкі, казачыя брыгады, аўтономныя, без'іменныя аддзелы, падтрымоўваючы «савецкі урад» душылі контр-рэвалюцыю: разганялі нацыянальныя з'езды і парлямэнты па Украіне, Беларусі, у Крыме, па Доне, у Туркестане, у Сыбіру—разстрэлівалі «сабо-

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоуна камандавання за 2 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

У шмат мейсцох фронту сільныя артылерыйскія пад тоукі выклікалі варожыя націскі. Яны былі адбіты.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Захадней Уазы—поудневей рэкі Эн варожыя дзея насыць разведчыкау. Сільныя варожыя атакі поудпевей Ур і Захадней Шато Тьерры намі былі адбіты.

Лейтэнант Удэт меу свае 37 і 38, лейтэнант Крол свае 28 і 29 перамогі у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

тажнікоў» праводзілі соцыялізацыю, чым займаюцца і цяпер. Ніякаго зьвязку з паселеннем у гэтых савецкіх рабусьнікаў німа. Але пазбаўленныя сваей інтэлігэнцыі, каторая уся уцягнута у кругаварот агульна-расійскаго жыцця, народы Расіі зрабіць з імі пакуль што нічога ні могуць.

З другога боку саусім нідаўно на тэррыторыі Расіі з'явілася новая сіла—чэхословакі. Гэтыя, пачаўшы свае апэрацыі ад граніцы Сыбіру —Чэлябінска—распасьціраюць свае ўлады на абодвы бокі ад гэтаго пункту. Імі нібы—то падтрымоўваецца у Заходнім Сыбіру чыста монархычны рух. Ні вомнім што яно так.

Расія цяпер край уселякіх авантураў і авантурнікаў. Авантурнікі соцыялізму зрабілі у цэнтры яе соцыялістычную рэспубліку, авантурнікі монархізму пачынаюць ад Сыбіру будаваць монархію. Ва Усходнім-жа Сыбіру тыя самыя чэхославакі разам з с.-р. бытцам бы маюць нейкія мэты падтрымаць дзержавы згоды і дзействуюць за іх патрыманнем. А на ўсёй Уральска-Сыбірскай тэррыторыі знайходзяцца нескольні такіх групп, з процiў большэвіцкімі, але ні аднагатунковымі орыентацыямі.

Усё гэта— ававантуры у тэй ці іншай форме, да якіх ніяк ні прычыняецца народ. Сыбіракі-аўтономісты па духу. Монархія ці рэспубліка у Расcii—іх мала абходзіць,—бо яны сыбіракі. Гэто самапачуцце настолькі моцна тамака у народзе, што можна быць саўсім пэўнымі за Сыбір—яна будзя аўтономнай дзержавай, тым болей, што сыбіракі, нават простыя селяне ведаюць сваю сілу і пышаюцца ёю.

Але пакуль што і там народ маўчыць,—адпачывае ад вайны, прыглядаецца да падзеяў. Калі-ж ён выступіць, то у Сыбіры ні астанецца мейсца ні для чэхословакоў, ні для в. к. Міхаіла, насколькі аны рэпрэзэнтуюць агульна-расійскую імпэрыялістычную авантуру.

Так на усёй тэррыторыі б. расійскай імпэрыі над заселяючымі яе народамі кідаюцца, як хвалі на мору, чужыя ім і нічым ні зьвязанныя з імі сілы. Новы пад'ем мора раскідае гэты бруд, які посіцца цяпер па верху, на беразі і зробіць чыстай вадзяную гладзь. Скольні часу чакаць трэба такога пад'ёму—згадаць трудна, але можна сказаць што ён наступіць тагды, калі голад і пануючая суматоха астатэчна надаедзяць вялікарускаму хлебаробу, каторы, пры усёй яго дзікасьці і азіятчыне у псіхалёгіі усё ж такі гаспадар і ўласьнік.

Аутонаміст.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

Летні вечар. Стада варочаецца дамоў. Людзі ідуць с поля па вячэру і, наагул, у вёсцы пачынаецца той ажыўлёны вячэрні рух пасьля доўгаго дня працы, каторы аглашае вёску энэргічнай гутаркай, скрыпам варот і, час ад часу, ядрэнай лаянкай.

Адна-адзінютка сідзіць на прызьбе убогай хацінкі сваей старая бабулька Аўдоцня. З ўсяго відаць, што яна вельмі засумавалася. Маўчыць. Ні с кім слова ні скажа, а па зморшчанаму дробнаму твару яе цякуць старчыя скупыя сьлёзы…

Я падыходжу.

— Добры вечар, бабулька!

— Вечар добры, дзеткі!

— Што так, бабулінька, засумовалася?

— А так і так, дзеткі, сып мой, во, чацьвёрты год, ды ішчэ да хаты ні вярнуўся. Раней бывало, калі грошы прышлець, а цяпер во,—ні слуху ні духу. Як пайшоў у «красноармэйцы», так і німа ад яго ніякіх чуткаў…

— Кепска, кепска,—пацьвярдзіў я,—трэба пацярпець, бабулінка, Бог дасьць і ён верніцца да хаты.

Бабулька моўчкі ківала галовой.

Пры гэтым я прыкмеціў, што нейкая «цётка» стаёмным відам рукою кліча мяне да сябе. Я падыходжу. Ажно яна у ішчэ болей таёмнай шопатнай гутарцы паведамляе мяне, што сына гэтай бабулькі, Арцёма, забілі у Маскве: так расказалі вярнуўшыеся аттуль вясковыя хлопцы, служыўшыя там у чырвонай арміі. Арцём быў ішчэ з дому чалавек піспакойны, а там шмат грошай грабаваў у людзей, дык вось Бог яго пакараў,—тлумачыла мне «цётка».

—А вось сэрцо старой чуе ніладнае, дагадываецца аб сьмертухне роднаго сына і кародзіцца бедная матка,—дакончыла сваё тлумачэнне кабета.

— А ўсё мужык вінават!—чую я голаспую гутарку з другой прызбы.

Я зацікавіўсм тым: чаму гэто «мужык вінават»? і падыпюў туды. Ажно гэто вядомы палітык у вёсцы, стары Паўлюк філёзафуе:

— Раней пры Мікалаю нам кепска жылося, кажа ён, ціскалі нас розпымі налогамі і усім тым, потым як яго скінулі і пайшлі «буржаз» біць, дык зноў нейкім дзівам кій ударыўся аб мужыцкую лабаціну… Катавалі нас польскія легіанэры, дзяруць селян розгамі ды растрэліваюць ды здзекуюцца там большэвікі… Ва усім мужык вінаватым астаецца… А, нябось, адукаваныя людзі выкручываюцца ад бяды і ім заўсягды жывецца лепей за нас. Дзе тут сабака падзета?—вобразна пытаецца аб прычыне прычын стары селянін, уталопіўшы вочы перад сабой.

— А вінавата наша адвечная мужыцкая цемната… — канчае Паўлюк са стонам у голасе.

Падарожны.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

КОНТРАСТЫ.

Бывало тут каліcь, ідзеш ля магазінау,
Праймуць жэ цябе хлопчынъ за хлопчынай:
—«Паночку! Што купляеш? Зайдзіце во да нас!
Пальто ці канялюх? а во касьцюм, атлас,
Манішкі, шпілячкі і шоукавы кашулі,
Цукеркі, шакалад, а во тарты, во дулі
Во здобны булачкі, во пернічкі —што хош,
Баранкі мо? Глядзі, каштуе штука грош!
Во піво, каву маш, какао, ліманад,
Во шкалік мапапулькі»—добры —быу жа лад!
О, людзі бышыя! Ідылія сьвятая!—
Так кожны наш менчук з дакорам успамінае.
Цяпер усе крамнікі вышэй стаяць нябес,
А хлебапек у верх падняу свой тоусты пос.
Чалом-чалом шауцу за гуму па падноскі!
Чалом-чалом крауцу за латы, за абноскі!
А што наконт яды, дык так бывае,
Што нават у міністрау толькі «чашка чаю».

Менчук.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У губэрскім прысуцтвії. У губэрскім прысуцтвіі у дзень выплаты пэнсіі, 20 чэрвеня, вышау ніспадзеваны сурпрыз. Скарбовая палата фармальнай паперай паставіла на від, што трэццяго члена прысутвія па штату ні патрабуецца, дзеля чаго і крэдыт на яго павінен быць зачынены. Прышлося перарабіць трэбавацэльную ведамасьць на пэнсію і зноу адправіць яе у палату, а служачым прысутвія надалей, да выпаунення фармальнай стараны справы, аставацца без грошай.

Па Ліб.-Ром. ж. д. Ліквідацыя упрауленскіх аддзелау ідзець вельмі слаба. Справа у тым, што вызначэныя для гэтай мэты ліквідацыйныя камісіі, ні меушы звышэй пунктуальных дырэктыу аб часе працы, вядуць яе павэдлуг агульнага цячэння спрау.

А бібліотэках. Губ. земство у сваю сьмету аддзела народнай асьветы ні унесло грошай на бібліатэкі па двум прычынам —шмат кніг для чытання німа дзе уляць усе роуна, а той малы лік, што можна дастаць купляюць за налічныя грошы ні толькі павятовыя, але і самі валасныя таварыствы, якія маюць цягу да кніг. Кніжны голад чуецца у іх востра і яны самі дастануць грошы на кнігі.

Во гэта і мело на мэці губэрскае земство!

Юбілейны дом, належачы раней сьв. Мікалаеускаму епархіяльнаму брацтву, заняло Беларускае Народнае Прэдстауніцтво.

Павялічэнне ставак. На землях залатагорскаго касьцелу, дзе настояцелем есьць кс. Маеускі, маюць быць павышаны арэндныя стаукі.

Апрача таго, арэндатарам зямель апавешчано, пад страхам судзебных рэпрэссій, аб узносе нідаімак, запушчаных за час вайны, зараз-жа.

Сэрыя сабранняу. Гэтымі днямі адбудуцца гадавыя сабранні адразу у трох установах—пушкінскай бібліатэцы, 1-м пазычкова-зьберагацельным таварыстве і меськім т-ве узаемнаго ад агня страхавання.

Пытанні дня: разгляд і пацьвярджэнні падрахунку за мінулы год і сьметы расходау на бягучы, бягучыя справы і выбары прауленняу

Апошняе пытанне — злоба дня пазычкова-зьберагацельнаго і страхавога таварыствау, дзе выбары кандыдатау на платныя мейсцы у до военных часау адбываліся старанными агітацыямі на акраінах сярод малоасьвядомленаго люду. Агітацыйныя прыемы насілі «амэрыканскі» адценак, з дадаткам падкупау і угашчэнняу…

Праверка бонавых кніжак у пяці бюро да 10-го ліпня ні закончыцца, дзеля вельмі марудпай працэдуры на праверцы і штэмплеванню кніжак. Штаты бонавых бюро мізэрны, агенты, мала звертаючы увагу на «доуга хвастатую» публіку, працуюць з легкім сэрцам, са сьмешкамі.

Беларускі хор. Беларускай Радай рэшано адпускаць беларускаму хору пад кірауніцтвам Цераускаго штомесячную субсідыю у размеры 1000 руб.

Названы хор, з багатым рэпэртуарам беларускіх народных песень, нажыу сабе папулярнасьць сярод менскай публікі.

Менская управа. Закончаны разгляд гадовай сьметы, якую ні выбрала сабе часу зрабі старая управа.

Цэны на кароуе масло, тр ху зьменшаныя за апош час, цяпер зноу павялічы юцца, да 12—13 руб. за ф.

Хлеб у вольнай прадаж каторы цяжка дастаецца, ідзе па $1^{1}/_{2}$—2—3 руб. за фунт

Дровы с прычын падво танеюць.

З дарогі.

Сушыла спачатку вясны, цяпер мочыць, алі мочыць меру. Першыя нідаўнія да джы падкрапілі жыто, хо ужо запозна. Тыдняў ка трох таму назад быў найбол шы праз вясну мароз, д жыто шмат дзе памёрзло, к ласы зьбялелі. А ярына ідзе добра. І пожні травой парас лі. Толькі ці будзіць што ка міць зімой, бо быдла шм меньш астаецца, малочныя г спадаркі страшна падупадаюц бо і на заводах кароў мала ця пер. Астатнімі днямі пашо цёплы дожджык, дык кінуліс расьці грыбы. Шчасьце дл людзей і гэта, бо шмат хто бедных жылі ужо 3 месяц я толькі травой (крапіва, шчаў сьвірэпка). Шмат у каго нім солі і дастаць німа дзе. Ко німа дзе купіць. Струмэнта сталярскіх і кавальскіх пейдз купіць.

А. А.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грыбланта.